## *Завочнае падарожжа*
## *“Жыццёвы і творчы шлях Янкі Купалы”*

**Мэты:** нагадаць вучням галоўныя факты з жыццёвага і творчага шляху Янкі Купалы; паказаць багацце жанраў творчасці пісьменніка; абудзіць цікавасць вучняў да жыццёвага шляху славутага песняра.

**Афармленне:** прэзентацыя, прысвечаная жыццёваму і творчаму шляху Янкі Купалы; партрэт Янкі Купалы; выстава літаратуры.

### Ход мерапрыемства

**Першы вядучы.** Паважаныя сябры. Сёння мы сабраліся з нагоды 125-гадовага юбілею славутага песняра беларускага народа Янкі Купалы. ***(слайд №1 )***

**Другі вядучы.** Творчасць нашага земляка вядома далёка за межамі Беларусі. Высокую ацэнку песняру даў і ўкраінскі аўтар Паўло Тычына. ***(слайд №2)***

**Першы чытальнік.**

“Янка Купала – гэта першая з вяршынь беларускага Эльбруса паэзіі. Магутная яна і чыстая, і высокая. Высокая, бо матывамі сваімі праўдзівая. Чыстая, бо мілагучная і майстэрская, а магутная, бо заўсёды была яна з народам”.

**Першы вядучы.** Бацькі – Дамінік Ануфрыевіч Луцэвіч і Бянігна Іванаўна Валасевіч – паходзілі з беларускай засцянковай шляхты. ***(слайд №3).*** Збяднелы род Луцэвічаў быў выселены са сваёй зямлі нейкім польскім князем. Маленства Янкі Луцэвіча прайшло на калёсах: з месца на месца пераязджала сям’я ў пошуках арэнды, але лепшага жыцця нідзе не знаходзілі.

**Другі вядучы.** Вязынка…Радзіма паэта. ***(слайд №4).*** Высокія дрэвы шумяць каля звычайнай сялянскай хаты. Недалёка працякае рачулка, над якой хіліцца лаза. У гэтай хаце 7 ліпеня 1882 года і нарадзіўся Янка Купала.

**Першы вядучы.** Ясь марыў пра навучанне, ***(слайд №5)*** але замест гэтага рана пачаў “чытаць сумную кнігу памешчыцкай раллі і пісаць журботную аповесць свайго гора сахой ды касою”. Толькі ў 15 гадоў змог закончыць за адну зіму, бо ведаў значна больш, чым патрабавалася, Бяларуцкае народнае вучылішча. Вось як пісаў Янка Купала ў вершы “Мая навука”:

**Другі чытальнік.**

Мне мудрасці кніжнай не даў Бог пазнаці,
Мой бацька не мог даць раскошаў такіх –
Наўчыўся я слоў беларускіх ад маці
І дум беларускіх без школы і кніг.
Ад самай красы маіх дзён невясёлых
Настаўнікам быў беларускі абшар;
Усходы палеткаў і гоманы ў сёлах
Навуку сваю мне прыносілі ў дар.

**Другі вядучы.** Янка Купала пачаў пісаць вершы, падобныя да народных песняў.

**Першы вядучы.**Першыя вершы пісаў па-польску, таму што беларуская мова забаранялася і не было ніякіх спадзяванняў убачыць свой твор надрукаваным. 15 ліпеня 1904г. – напісаны верш на беларускай мове “Мая доля” – самы ранні вядомы беларускі твор Купалы. ***(слайд №6 ).***

**Другі вядучы.** А 15 (28)мая 1905г. у прагрэсіўнай грамадска-палітычнай і літартатурнай мінскай газеце “Северо-Западный край” апублікаваны на беларускай мове верш “Мужык”, падпісаны псеўданімам “Я.Купала”. Гэта першае выступленне паэта ў друку. Верш “Мужык” перакладзены на 20 моў свету.

**Першы вядучы.** 24 лістапада 1906г. – першае паведамленне ў беларускім друку пра Янку Купалу і яго зборнік “Жалейка”. ***(слайд №7).*** Гэтая кніга перадавала думкі і перажыванні, выказаныя ад імя самога паэта. Многія вершы зборніка адкрыта накіраваны супраць панства. Гэта стала прычынай таго, што ў Пецярбургу, а потым і ў Вільні на кнігу быў накладзены арышт, і зборнік быў двойчы канфіскаваны. А аўтара і тых, хто выдаў кнігу, прыцягнулі да судовай адказнасці. Толькі пасля адпаведных захадаў аўтара і яго знаёмых С.-Пецярбургская судовая палата 10 лістапада 1908г. зняла арышт са зборніка “Жалейка”.

**Другі вядучы.** У 1910 годзе ў Пецярбургу выйшаў другі зборнік вершаў паэта “Гусляр”. Вясной 1913г. у Пецярбургу выйшаў трэці зборнік паэзіі Янкі Купалы – “Шляхам жыцця”. Потым былі “Спадчына”, “Безназоўнае”, “Хлопчык і лётчык”…

**Першы вядучы.** Лета 1913 года было надзвычай плённым для паэта: з’явіліся новыя вершы, паэмы, артыкулы. У Акопах ён

напісаў паэмы “Бандароўна”, “Магіла льва”, “Яна і я”, п’есы “Прымакі”, “Раскіданае гняздо”.***(слайд 8).***

**Другі вядучы.** А свой першы драматычны твор – славутую камедыю “Паўлінка” – Купала закончыў 3 чэрвеня 1912г. таксама на хутары Акопы. ***(слайд №9).***

**Трэці чытальнік.**

“На адным з суботніх вечароў у Пецярбургу – успамінала Паўліна Мядзёлка – першая выканаўца ролі Паўлінкі – ён прачытаў нам п’есу. Адразу ж паўстала думка паставіць п’есу на карысць студэнцкай касы ўзаемадапамогі. Рэпетыцыі адбываліся дзе толькі можна было, часцей за ўсё ў адным з пакояў клуба паштавікоў. Янка Купала прымаў актыўны ўдзел і ў размеркаванні роляў, і ў рэпетыцыях як кансультант”.

**Першы вядучы.** Камедыя “Паўлінка” ўвайшла ў залаты фонд беларускай драматургіі, стаўшы яе класікай. На аснове гэтага твора Беларускім тэлебачаннем пастаўлены фільм “Пасля кірмашу” (1973, рэж. Ю.Цвяткоў, сцэнарый А.Макаёнка).

**Другі вядучы.** Многія вершы Янкі Купалы пакладзены на музыку ***(слайд №10).*** Сярод іх “Спадчына”, “Марыся”, “Малітва”, “Хлопчык і лётчык”, “Не глядзі”… А верш “А хто там ідзе?” рускі пісьменнік Максім Горкі назваў “суровай і красамоўнай песняй, гімнам беларусаў”.

**Першы вядучы.** Запаветная мара паэта – каб яго творы сталі блізкімі працоўнаму народу…

**Першы чытальнік.**

Дык жа знайце, чаго б я хацеў,
Аб чым думачкі толькі мае:
Каб мой люд маю песню запеў
І пазнаў, аб чым песня пяе!

**Другі вядучы.** Надзеі паэта збыліся. Яго творы вядомыя не толькі сярод беларускага народа, але і далёка за межамі Радзімы: творы Купалы выдадзены на 60 мовах народаў свету тыражом каля 5 мільёнаў экземпляраў. ***(слайд №11).***

**Першы вядучы.** ***(слайд №12).*** 28 чэрвеня 1942 года Янкі Купалы не стала. Паэт трагічна загінуў у гасцініцы “Масква”, дзе жыў з 21 чэрвеня. Пахаваны Купала ў Маскве. Урна з прахам Янкі Купалы перавезена ў 1962 годзе ў Мінск і пахавана на вайсковых могілках.

**Другі чытальнік.**

І покуль жыць будуць людзі,
Покуль сонца будзе ўсходзіць,
Жыць Купалы песня будзе
І імя яго ў народзе.

А.Бачыла, Несмяротнаму Янку Купалу”.

**Другі вядучы.** Вось і падышло да канца наша падарожжа. Але кожны з вас гэтае падарожжа можа працягваць сам, звяртаючыся да кніг славутага земляка. Хачу пажадаць вам як мага больш сустрэч з беларускім словам.















П’еса “Паўлінка” (1912г.)
ПАВЛИНКА


Вершы, пакладзеныя на музыку


Выданні твораў Янкі Купалы
на беларускай мове
на мовах народаў СССР


Я адплаціў народу
Чым моц мая магла:
Зваў з путаў на свабоду,
Зваў з цемры да святла.
Янка КУПАЛА